## МЫТНЫЯ “ФОКУСЫ”



ЦІ АБВАЛІЦЦА АЎТАРЫНАК

СТАР. 4

ТУТ І ЦЯПЕР

## ДЭФІЦЫТНЫЯ ДАЯРКІ

У МАРАХ АБ 700-800 ДОЛАРАЎ



СТАР. 5

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА 28.04.10-4.05.10 г.

# ПА АБКАТАНАЙ…

## У Беларусі адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы, якія мала чым адрозніваліся ад мінулых выбарчых кампаній



*Такія вось у нас выбары – без адрыву ад вытворчасці*

### ВЫНІКІ “НА ВУХА”

Гэта прызнаюць палітычныя партыі дэмакратычнай накіраванасці і праваабаронцы. Напрыклад, вось што сказаў **Сяргей Вазняк**, член Мінскай гарадской выбарчай камісіі, член бюро Цэнтральнага камітэта партыі “Справядлівы свет” (раней Партыя камуністаў Беларусі): “На ўчастку для галасавання № 7 Акадэмічнай выбарчай акругі № 48, на якім я правёў асноўны час, вынікі падліку галасоў былі проста ашаламляльнымі. За кандыдата Зігмунда Гядрэвіча, галоўнага ўрача анкалагічнага дыспансера, выбаршчыкі аддалі 1023 галасы, 47 чалавек прагаласавалі за індывідуальнага прадпрымальніка Аляксандра Лісава, а 63 аддалі перавагу Валерыю Ухналёву, намесніку старшыні партыі “Справядлівы свет”. Думаю, улада магла б падысці да лічбаў больш сціпла. Такая адкрытая перавага — гэта ўжо занадта. Да таго ж на згаданым участку датэрмінова прагаласавалі больш за 50% выбаршчыкаў — 651 чалавек, а ў дзень выбараў — 542 чалавекі”.

На думку Вазняка, нічога асаблівa прынцыповага падчас сёлетняй выбарчай кампаніі не адбылося: “Першы момант — гэта непрадастаўленне назіральнікам магчымасці бачыць, за каго былі аддадзены галасы выбаршчыкаў у бюлетэнях. Другім момантам стала тое, што кожны сябра камісіі падлічваў толькі свой стос бюлетэняў, пасля чаго паведамляў вынікі старшыні камісіі «на вуха». Думаю, такая практыка працы назіралася па ўсёй краіне. Канчатковыя лічбы вынікаў галасавання ведаў толькі сакратар камісіі, які і агучыў іх. Ва ўмовах, калі няма ніякага кантролю з боку членаў участковай камісіі, нельга казаць аб даверы да вынікаў падліку галасоў”.

*Заканчэнне на стар. 3*

### ДАСЛОЎНА

**У інтэрв’ю БелаПАН 25 красавіка сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазовік адзначыў, што не выключае таго, што прэзідэнцкія выбары могуць быць прызначаны на канец 2010 года.**

**На просьбу пракаменціраваць інфармацыю, прыведзеную ў лістоўцы кандыдата ў дэпутаты мясцовых Саветаў ад Ліберальна-дэмакратычнай партыі, дзе сцвярджаецца, што прэзідэнцкія выбары адбудуцца ў гэтым годзе, Лазовік сказаў: “Спадар Гайдукевіч, напэўна, па-свойму лічыць каляндар, і цалкам магчыма, што ён не памыляецца. Прэзідэнцкія выбары павінны адбыцца за два месяцы да заканчэння паўнамоцтваў дзеючага прэзідэнта.**

**Калі зыходзіць з таго, што інаўгурацыя Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі праходзіла, калі я не памыляюся, 6 красавіка, то чарговыя выбары павінны адбыцца не пазней як 6 лютага. Раней — магчыма. Мо ў спадара Гайдукевіча ёсць асаблівае прадчуванне і ён якраз угадаў, якое рашэнне прыме парламент пры назначэнні даты выбараў. Цалкам верагодна, што гэтыя выбары будуць прызначаны і на канец 2010 года”.**

### SOS!



## КАПЕЙКА «НАЛЕВА» НЕ ПОЙДЗЕ

### Лукашэнка, наведваючы Петрыкаўскі раён, загадаў абысці расійскіх акцыянераў пры падзеле прыбытку ад венесуэльскай нафты

«Калі хоць адна капейка пойдзе на той бок, крыўдуйце на сябе, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да генеральнага дырэктара Мазырскага НПЗ Анатоля Купрыянава. — Усе да капейкі грошы і прыбытак павінны быць у Беларусі. Ім не трэба было перапрацоўваць нафту, і прыбытак не быў патрэбны. Калі нехта будзе перашкаджаць, гаварыце адразу».

Маецца на ўвазе, што сваіх дывідэндаў не павінны атрымаць расійскія акцыянеры завода. Асноўныя акцыянеры ААТ «Мазырскі НПЗ» — урад Беларусі (42,76% акцый) і кампанія «Слаўнафта» (42,58% акцый). 12,25% акцый трымае ААТ «МНПЗ+», якое належыць дзяржаве. Яшчэ 2,41% акцый падзелены між фізічнымі асобамі.

Вось што расказаў журналістам Анатоль Купрыянаў: “Мазырскі НПЗ гатовы перапрацоўваць гэтую нафту. Яна высокай якасці, з вялікай колькасцю светлых нафтапрадуктаў у саставе і нізкім паказчыкам серы”

**ЛЮДМІЛА САЦ, БЕЛТА**

# ШТО ДЛЯ ВАС І ВАШЫХ ЗНАЁМЫХ ЗНАЧАЦЬ МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ-2010?

**ТАІСІЯ КАБАНЧУК, СЯБРА БХД, БАБРУЙСК:**

## “ВЫБАРЫ— НЕ ПАДЗЕЯ”.

— Выбары адчуваліся толькі на ўчастках. Музыка аглушала ўсіх выбаршчыкаў расійскай папсой. А так па горадзе ішло звычайнае жыццё. Вісела расцяжка на галоўнай вуліцы, што сёння выбары, і ўсё. Плакаты з інфармацыяй ад кандыдатаў усе пазрывалі. Некаторыя мае знаёмыя, якіх я 25 красавіка сустракала, нават не ведалі, што выбары адбываліся. Многія махалі рукой — маўляў, нам не да выбараў. Народу гэтыя выбары нецікавыя.

**ЮРЫЙ ІСТОМІН, СЯБРА АГП (ГРОДНА):**

## “ЛЮДЗЕЙ У ГРОДНЕ ЦІКАВЯЦЬ ПРАБЛЕМЫ ІНФРАСТРУКТУРЫ”.

— Калі меркаваць па маім раёне, дык выбары людзей хвалявалі — пра іх гаварылі у транспарце, у чэргах. Адзначалася вялікая яўка людзей на выбарчыя ўчасткі. Я самназіраў за закрытым участкам у бальніцы: там прагаласавала сто працэнтаў, як заўсёды. І вынікі, як заўсёды: 198 чалавек з 212 прагаласавалі за кандыдата ад улады, 10 — за нашага кандыдата. Там не адзін раз праходзілі сустрэчы з выбаршчыкамі. Лекары агітавалі за ўладнага кандыдата.

Што людзей хвалюе найбольш? Развіццё мясцовай інфраструктуры — дарогі, паліклінікі, дзіцячыя пляцоўкі, гандлёвыя цэнтры і гэтак далей. Канечне, багата пытанняў па агульна-палітычнай сітуацыі: Лукашэнка і Бакіеў, Лукашэнка і Расія.

**ДА ВЕДАМА**



Еўрарадыё склала спіс самых заможных кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў і высветліла, наколькі прыбытковасць уплывае на меркаванне выбаршчыкаў.

Еўрарадыё прагледзела спісы кандыдатаў у дэпутаты Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага, Бабруйскага гарадскіх і Мінскага абласнога савета дэпутатаў і склала спіс самых «заможных».

Найвялікшы даход у 2009 годзе атрымаў генеральны дырэктар ТАА “ЗОВ” Уладзімір Зухавіцкі з Гродна - 277 мільёнаў 768 тысяч рублёў. Назавем яшчэ шэсць “прызераў” гэтага «чэмпіянату”.

2. 199 мільёнаў 665 тысяч. Генеральны дырэктар прадпрыемства “ХенкельБаўтэхнік” Сяргей Навіцкі. Мінскі абласны савет.

3. 156 мільёнаў 325 тысяч. Генеральны дырэктар “Беларуськалія” Валерый Кірыенка. Мінскі абласны савет.

4. 139 мільёнаў 194 тысяч. Дырэктар ТАА “Студытплюс” Андрэй Прысяжнюк. Мінскі абласны савет.

5. 130 мільёнаў. Прарэктар Гомельскага ўніверсітэта імя Скарыны Сяргей Ханеня. Гомельскі гарсавет.

6. 111 мільёнаў 341 тысяча. Гендырэктар “Будтрэста №3” Мікалай Ашэйчык. Мінскі абласны савет.

**МІКОЛА ЗІМІН, ШАХЦЁР (САЛІГОРСК):**

## “УСІМ УСЁ “ПА БАРАБАНЕ”.

— Людзям усё “па барабане”, таму што на працы ніхто не абмяркоўваў выбары, кажуць: каго прызначаць, той і будзе. Улёткі праўладных кандыдатаў віселі ў рудаўпраўленні, ніхто іх не чытаў. Асабіста я не галасаваў, бо не бачыў аніякага сэнсу. Праўда, ніхто нікога на выбары не заганяў -- няма планкі, якая абмяжоўвала б колькасць тых, хто прагаласаваў. Дэпутатаў мінулых скліканняў ніхто ў вочы не бачыў. Слядоў іхнай дзейнасці таксама не бачна — як былі на дарогах ямінь, так і засталіся. У Салігорску ў сувязі з эканамічным становішчам пануе атмасфера апатыі. У траўні шмат хто з шахцёраў пойдзе хто куды. Кагосьці, як заўжды, з забояў “перакінуць” на нейкую будоўлю. Склады поўныя, і як далей працаваць — ніхто не ведае.



*Дарогі цікавяць выбаршчыкаў больш за ўсё*

**ЛЕРА СОМ, ПАЭТКА (ПОЛАЦК):**

## “ЛЮДЗІ НЕ ВЕРАЦЬ НІ СТАРЫМ, НІ НОВЫМ ДЭПУТАТАМ”.

— Я схадзіла на выбары і з’ела чабурэк. Прагаласавала супраць усіх, таму што мне не далі выбару, таму што там два “фрукты”, за якіх бы ніколі ў жыцці не прагаласавала б. У нас многіх людзей тым ці іншым спосабам заганялі на датэрміновае галасаванне. Не тое, каб гвалтам гналі, але нагадвалі: “А вы ж схадзіце, а гэта ж ваш грамадзянскі абавязак”. А той народ, які хоць трошкі цікавіцца палітыкай, кажа, што выбіраць няма з каго. І большасць маіх знаёмых казалі, што будуць галасаваць супраць усіх. Людзі не вераць ні тым дэпутатам, якія ёсць, ні тым, якіх нібыта абяруць. І абсалютна не вераць, што тыя ці іншыя дэпутаты хоць нешта зменяць.

**ТАЦЦЯНА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ (МАЗЫР):**

## “СЁЛЕТНІЯ ВЫБАРЫ КРЫХУ НАГАДВАЛІ САПРАЎДНЫЯ ВЫБАРЫ”.

— Мы жывём у Чыгуначным мікрараёне Мазыра — самым бедным і праблемным раёне горада. Сёлетнія выбары крыху нагадвалі сапраўдныя выбары толькі таму, што ў іх удзельнічаў Францішак Вячорка. Ён вельмі пісьменна праводзіў сваю агітацыйную кампанію — хадзіў ад хаты да хаты, гутарыў з людзьмі пра ўсё набалелае: пра дамы, якія як пабудаваліся палоннымі немцамі пасля вайны, так і не ведалі капітальнага рамонту і хутка ўсе абваляцца; пра дарогі, якія і дарогамі назваць цяжка; пра адмененыя чарнобыльскія льготы, якія асабліва “ўдарылі” па тых сем’ях, дзе ёсць дзеці. Раней, пакуль былі льготы, мы не плацілі за харчаванне ў школе і бясплатна аздараўляліся ў санаторыях. Зараз за школьнае харчаванне мы плацім 50 тысяч у месяц на адно дзіця, а калі іх два, то выходзіць сто тысяч. За санаторый трэба аддаць 500—700 тысяч. Дзе іх узяць? Таксама адмянілі льготны праезд для школьнікаў...

# ПА АБКАТАНАЙ...

*Заканчэнне.*
*Пачатак на стар. 1*

## ВІНАВАТЫ НЕ ТОЛЬКІ ЎЛАДЫ

Такога ж меркавання прытрымліваюцца незалежныя эксперты. Вось што сказаў **нашаму выданню** палітолаг **Ігар Домаш**: "Амаль 80 працэнтаў цяперашніх членаў выбарчых камісій ужо працавалі раней у гэтай якасці. Безумоўна, гэта не магло не адбіцца на механізме падліку галасоў выбаршчыкаў, якія цяжка назваць празрыстым пры ўсім жаданні. Можа, нейкі ўплыў на ход гэтай выбарчай кампаніі маглі аказаць міжнародныя назіральнікі, але супрацоўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў у нашай краіне запрасілі паглядзець на тое, як праходзяць выбары, толькі ў дзень галасавання".

На думку Домаша, у тым, што выбары прайшлі па абкатанай схеме, вінаваты не толькі ўлады, а і сама апазіцыя: "Адзінай кааліцыі з выразнай і зразумелай шырокім народным масам тактыкай і на гэты раз не атрымалася. Левы блок (БСДП (Грамада), партыя "Справядлівы свет", незарэгістраваная партыя працы) ішоў сваім шляхам, правы блок (АГП, БНФ, рух "За свабоду" дый інш.) — сваім. Падаецца, што многія ў апазіцыі за апошнія 16 год проста сталіся. А маладых і "гарачых" не так і шмат. Калі апазіцыя не зробіць сур'ёзных высноў з гэтых выбараў, то яна асуджана на пройгрыш падчас больш сур'ёзнай і важнай кампаніі — прэзідэнцкай".

## І Ў АПАЗІЦЫІ ЁСЦЬ НАРМАЛЬНЫЯ ЛЮДЗІ...

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына паведаміла, што выбрана 21 293 дэпутаты, якім трэба будзе сфарміраваць 1495 мясцовых Саветаў. Яшчэ яна шмат гаварыла пра высокую актыўнасць грамадзян у ходзе галасавання. Аб праколах ні слова, хаця іх хапала. Напрыклад, на 73-м выбарчым участку Мірашнічэнкаўскай выбарчай акругі № 43 Савецкага раёна Мінска ў спіс для галасавання дома былі ўключаны імёны чатырох нябожчыкаў... Такіх "казусаў" хапала. Але, канечне, нават іх публічная фіксацыя наўрад ці паўплывае на правілы гульні на будучых прэзідэнцкіх выбарах. Адной фіксацыі тут малавата.

Закончыць гэты тэкст хочацца ацэнкай сёлетняй выбарчай кампаніі Аляксандра Лукашэнкі: "Я ведаю, што выбары адбыліся практычна ва ўсіх акругах. Выбраны нармальные, здольныя працаваць людзі. Ёсць, праўда, і апазіцыянеры. ...Гэта выклікала пэўную занепакоенасць у шэрагу чыноўнікаў. Я ім кажу: супакойцеся, апазіцыя ж не аднастайная, яна розная, там таксама ёсць нармальныя людзі».

А вось ці супакоіцца і расслабіцца ў чарговы раз пасля буйной палітычнай кампаніі апазіцыя, залежыць толькі ад яе самой.

**ВІКТАР АЛЯШКЕВІЧ**

# АЙЦЕЦ АЛЯКСАНДР НАДСАН: «ДЗІЎНА МНЕ ГЭТА БАЧЫЦЬ НА РАДЗІМЕ»

У час чарговага візіту Айца Аляксандра Надсана ў Беларусь з апостальскім візітатарам для беларусаў-каталікоў у замежжы пагутарыў карэспандэнт TUT.BY.

**— Вы ўпершыню наведалі Беларусь у 1990 годзе. Чым здзівіла радзіма пасля амаль паўвекавога расставання?**

— Я ехаў у Мінск цягніком і думаў, што аб маім прыездзе ніхто не ведае, а тут — поўны перон людзей на вакзале, радасць, бел-чырвона-белыя сцягі! Мяне пасадзілі ў машыну, высунулі з вакна нацыянальны сцяг і павезлі праз цэнтр горада ў "Планету". А гэта ж быў яшчэ Савецкі Саюз. Вядома, потым я агледзеўся і зразумеў, што не ўсё так радасна. Аднак, прынамсі, убачыў, што ёсць маладыя патрыёты, якія, як і мы на эміграцыі, мараць аб незалежнай беларускай Беларусі.

**— Як Беларусь змянілася за гэтыя 20 год?**

— У 1990-м годзе ў беларускім грамадстве было больш аптымізму і энтузіязму. Цяпер, што б ні здарылася, людзі ставяцца да гэтага як да нормы.

Сітуацыя з беларускай мовай, асабліва з беларускім школьніцтвам, цяпер яшчэ



горшая, чым у савецкія часы. Мы праз 60 гадоў захавалі мову на эміграцыі, а ў самой Беларусі гэтага зрабіць не здолелі. Прыязджаеш — паўсюль расійшчына.

Аднойчы нас з Мальдзісам за мову ледзь не пабілі. Было гэта праз некалькі месяцаў пасля вашага рэферэндуму па мове і сімволіцы. Сядзім мы з Адамам на лаўцы каля помніка Перамогі, размаўляем, натуральна, па-беларуску. Падыходзяць два маладзёны на-

**ДАВЕДКА**

**Аляксандр Надсан (сапр. Бочка) Пераклаў з грэчаскай мовы на беларускую корпус усходніх літургічных тэкстаў. Аўтар больш за 250 навуковых публікацый, кніг па гісторыі Беларусі і гісторыі беларускага хрысціянства XX ст., малітоўніка «Госпаду памолімся» (2002), які ёсць афіцыйным тэкстам набажэнстваў Беларускай грэка-каталіцкай царквы.**

**Вызначыў год выдання «Малой падарожнай кніжкі» Скарыны (1522), а таксама расчытаў ды ўвёў у навуковы ўжытак аль-кітабы беларускіх татараў.**

**Ганаровы доктар Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Вільня). Ведае 9 моў.**

падпітку: "Хватит уже на этой трасянке говорить. Разговаривайте на человеческом языке!" "Што, мы не можам у сваёй краіне на роднай мове размаўляць?", — спакойна запытаўся я, і яны неяк адразу адступілі.

**— Ці мажлівая ў гістарычнай перспектыве незалежная дзяржава Беларусь без беларускай мовы?**

— Мне гэта цяжка ўявіць і прыняць. Вось учора (гутарка адбылася 25 красавіка — TUT.BY) я даваў шлюб маладой пары і пасля вяселля трохі пасядзеў з гасцямі ў нейкай карчме ў Дудутках. Цётка, апранутая ў псеўдафальклорны строй, вяла ўсё па-беларуску. Але, як толькі была патрэба нешта сказаць "у жыцці", пераходзіла на расійскую. То бок, яна ведае беларускую мову, але ўжывае яе толькі па працы — калі за гэта плацяць. Так і госці. Песні беларускія ўсе ведаюць, спяваюць. Як толькі скончылася песня, усё па-расійску. У Брытаніі многія дзеці беларусаў таксама не могуць па-беларуску. Але ж там не Беларусь! Дзіўна мне ўсё гэта бачыць на радзіме...

**КАСТУСЬ ЛАШКЕВІЧ, TUT.BY**

# АЎТАРЫНАК ЧАКАЕ АБВАЛ?

**Адна з найбольш непрыемных для беларусаў перспектыў — павелічэнне мытных пошлін на імпарт легкавых аўто — верагодна, будзе скасавана. Аднак і перапрадаць з выгадай сваё аўто ў Расію не атрымаецца.**

За апошняе дзесяцігоддзе беларусы канчаткова прызвычаіліся да "іншамарак" — такую мянушку на скрыжаванні васьмідзясятых-дзевяностых атрымалі аўтамабілі нерасійскай вытворчасці. Тады яны яшчэ былі экзотыкай у нашых краях, але паступова "Форды", "Пежо", "Таёты" і нават "Мерсэдэсы" зрабіліся "па кішэні" беларусам. Больш багатыя набывалі новыя аўто ў салонах, людзі з больш сціплым заробкам — патрыманыя на рынку або праз перагоншчыкаў. У бок "Жыгулёў" многія ўжо нават глядзець не хацелі.

Аднак напрыканцы мінулага года ўзнікла сур'ёзная пагроза — Беларусь падпісала Мытны саюз з Расіяй ды Казахстанам. Праз гэта мусілі істотна павялічыцца мытныя пошліны на імпарт легкавікоў у нашу краіну, на чым настойвала Расія, спрабуючы такім шляхам уратаваць уласны нягеглы аўтапрам.



*Тэрміновае набыццё іншамарак перастае быць актуальным*

І сапраўды, з 1 студзеня беларускія мытныя пошліны на імпарт легкавікоў былі ўзняты да ўзроўню расійскіх (пакуль толькі для юрыдычных асоб). Простыя грамадзяне атрымалі адтэрміноўку да 1 ліпеня.

Справа такая, што з новымі пошлінамі кошт аўтамабіля ў залежнасці ад года выпуску ды аб'ёму рухавіка робіцца значна даражэйшым — часам у 2-3 разы. Натуральна, што мала хто з пакупнікоў адужае такое павышэнне. Таму многія аўтааматары імкнуліся да 1 ліпеня паспець памяняць свайго "жалезнага каня" на новага, каб даўжэй паездзіць пасля ўвядзення новых мытных пошлін. А найбольш кемлівыя набылі нават некалькі легкавікоў, спадзеючыся з выгадай перапрадаць іх у Расію. Сцвярджаюць, што ў Ашмянах ледзь не ў кожным двары стаіць па 3-5 "адзінак тавару".

Аднак падзеі пачалі разгортвацца не зусім так, як чакалі аўтабізнесоўцы. Днямі ў прэсу патрапіў ліст Федэральнай мытнай службы Расіі, у якім гаворыцца, што апошнім часам павялічылася колькасць увезеных у РФ з мэтай перапродажу аўтамабіляў, якія належаць грамадзянам Беларусі. Змагацца з гэтай тэндэнцыяй у Маскве вырашылі проста: аўтамабілі, знятыя з рэгістрацыйнага ўліку ў Беларусі, пры ўвозе ў Расію абкладаюцца ўсімі існуючымі там мытнымі пошлінамі. Такім чынам, спадзяванні на тое, што мяжа зробіцца празрыстай і на гэтым можна будзе добра зарабіць, ляснулі.

Але ж гэта яшчэ не ўсё. На мінулым тыдні намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей Барысік заявіў, што пазіцыя нашай краіны палягае ў тым, каб не павялічваць мытныя пошліны для фізічных асоб і пасля 1 ліпеня.

Карацей кажучы, і расійскія, і беларускія ўлады дэманструюць, што Мытны саюз Мытным саюзам, а свая кашуля бліжэй да цела. З улікам таго, што апошнім часам паразумення паміж Мінскам і Масквой наогул няшмат, верагоднасць таго, што бакі за два месяцы неяк урэгулююць гэтую складаную сітуацыю, мізэрная.

Сукупнасць гэтых двух чыннікаў — адмовы ад павелічэння пошлін для фізічных асоб у Беларусі і заслона на расійскай мяжы — можа выклікаць абвал на беларускім аўтарынку. Легкавік — гэта, канечне, не мандарыны: псуецца не так хутка. Аднак, улічваючы тое, што закансерваваць аўто таксама не выпадае, тыя, хто набыў іх з мэтай перапродажу, аказаліся ў складанай сітуацыі. Цяпер ужо не вядзецца гаворка пра тое, каб добра зарабіць, — абы вярнуць сваё. Усё ідзе да таго, што неўзабаве на беларускі аўтарынак патрапяць тысячы машын, а пакупнікі будуць круціць носам, разумеючы, што ім няма куды спяшацца.

У такіх умовах прадаўцы (асабліва тыя, хто набыў аўто на пазычаныя грошы) мусяць істотна зніжаць кошты, бо інакш рызыкуюць зазімаваць са сваім таварам дзе-небудзь на "Ждановічах" або ў "Малінаўцы".

**ВАЛЯНЦІН СЫЧ**

# КІЕЎ ДАЕ ДАБРО РАСІЙСКАМУ ФЛОТУ

**Украінскі і расійскі парламенты сёння ратыфікавалі пагадненне аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання Чарнаморскага флоту ў Крыме да 2042 года.**

Пагадненне было дасягнута прэзідэнтамі Украіны і Расіі Віктарам Януковічам і Дзмітрыем Мядзведзевым падчас іх сустрэчы ў Харкаве 21 красавіка.

Цаной за згоду Кіева на дыслакацыю расійскага флоту на ўкраінскай тэрыторыі да 2042 года было зніжэнне кошту на расійскі газ для Украіны.

Падчас сустрэчы Януковіча з Мядзведзевым "Газпрам" і "Нафтагаз Украіны" падпісалі дапаўненні да кантрактаў аб пастаўках і ўмовах транзіту расійскага газу да 2019 года. Януковіч паведаміў журналістам, што Масква пайшла насустрач Кіеву, знізіўшы кошт на газ для Украіны з 330 да 230 долараў за тысячу кубаметраў. У выніку на працягу 10 гадоў Украіна атрымае «інвестыцыйную дапамогу» ад Расіі ў выглядзе газу на суму каля 40 мільярдаў долараў.

У Дзяржаўнай думе Расіі ратыфікацыя дамовы аб дыслакацыі Чарнаморскага флоту ў Крыме прайшла без праблем. Там за дамову прагаласавалі 410 дэпутатаў. Затое ў Вярхоўнай Радзе ў Кіеве ратыфікацыя адбывалася пры вельмі гучных пратэстах апазіцыі — як у будынку парламента, так і знутры звонку. Дэпутаты апазіцыі закідвалі старшыню Вярхоўнай Рады Уладзіміра Літвіна яйкамі, калі ён адкрываў сесію і прымаў прысягу ад новых дэпутатаў. Потым у зале Вярхоўнай Рады пачаліся тузаніна і бойкі, і памяшканне напоўніў дым ад дымавых шашак. Нягледзячы на такія абставіны, Літвіну ўдалося паставіць дамову аб Чарнаморскім флоце на галасаванне, і яе падтрымалі 236 дэпутатаў. Паводле паведамленняў украінскіх СМІ, на сесіі было зарэгістравана 211 дэпутатаў.

Бойкі і тузаніна ўзніклі таксама і паміж прыхільнікамі парламенцкай большасці, апазіцыі ды міліцыяй перад будынкам Вярхоўнай Рады.

**РАДЫЁ СВАБОДА**

# ДЭФІЦЫТНЫЯ ДАЯРКІ

Мінаблвыканкам запрашае на працу адразу ажно восем кіраўнікоў сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў. Прычым амаль усім прапаноўваецца жыллё. Праўда, гэта далёка не поўны спіс вакантных пасад, што існуюць на сённяшні дзень у структурных падраздзяленнях аблвыканкама і абласных арганізацыях.

**ЧУЖЫ КАШАЛЁК**

## КОЛЬКІ ЗАРАБЛЯЮЦЬ ДАЯРКІ?

Мяркуючы па рубрыцы "Вакансіі" на сайце Мінаблвыканкама, у нас сёння назіраецца дэфіцыт даярак. Прадстаўнікі гэтай прафесіі патрабуюцца амаль ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці. А ў некаторых гаспадарках вакантнымі з'яўляюцца ад двух да пяці працоўных месцаў.

Два гады назад крылатым стаў выраз кіраўніка дзяржавы А.Лукашэнкі пра тое, што простая беларуская даярка на ферме *"ў добры перыяд атрымлівае 700—800 долараў"*. Цяжка меркаваць, які перыяд мы перажываем цяпер, але ў тых арганізацыях, з афіцыйным спісам якіх можна азнаёміцца на сайце Мінаблвыканкама, даяркам гатовы плаціць зусім іншыя грошы.

Так, **у Мінскім раёне** ў філіяле "СлаўНафта-Агра СП ЗАТ СлаўНафта-Старт" не хапае трох даярак. Жадаючым абяцаюць заробак у 369,2 тысячы беларускіх рублёў. У ААТ "Гастэлаўскае" (Сеніца) патрабуюцца чатыры даяркі. Ім абяцаюць плаціць штомесяц месяц па 700 тысяч. Для параўнання: там жа патрабуюцца чатыры трактарысты-машыністы (заробак — 940 тысяч) і адзін каваль (600 тысяч).

**Маладзечанскі раён:** СВК "Гранічы" прапануе даярцы 600 тысяч плюс месца ў інтэрнаце, а СВК "Холхлава" — 500 тысяч ды хату сядзібнага тыпу.

**Барысаўскі раён:** у СВК "Замош'е" даярка будзе зарабляць больш, чым галоўны энергетык, праўда, усяго толькі на 20 тысяч беларускіх рублёў — 600 тысяч. Аналагічны заробак прапануецца даяркам **у Пухавіцкім раёне.**

**Смалявіцкі раён:** ААТ "Смалявіцкі райагрaсэрвіс" заплаціць даярцы 450 тысяч.




*Хіба што за такую працу даяркі можна атрымліваць 500 тысяч рублёў*

Столькі ж тут будзе атрымліваць і трактарыст-машыніст.

**Чэрвеньскі раён:** СВК "Крыніца Ігуменшчыны" патрабуюцца дзве даяркі. Ім абяцаюць заробак 700 тысяч і хату сядзібнага тыпу. А вось трактарыст-машыніст там зарабляе на 43 тысячы больш.

У СВК "Кастрычніцкая рэвалюцыя" **Дзяржынскага раёна** чакаюць дзвюх даярак. Ім прапануецца заробак у 800 тысяч. Столькі ж там атрымлівае і слесар МТФ.

**У Капыльскім раёне** СВК "Пацейкі" патрабуюцца чатыры даяркі. Іх заробак — 630 тысяч. Усіх забяспечваюць дамамі з выгодамі.

**ЭКСПЕРТЫЗА**

**Аляксандр ЯРАШУК,** старшыня Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў, у мінулым — першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў АПК:

— Што тычыцца даярак, то іх не хапала заўсёды, у тым ліку і ў савецкія часы, — гаворыць Аляксандр Ільіч. — І гэта пры тым, што тады для іх будавалі жыллё, імкнуліся ўсялякімі спосабамі прыцягнуць аператараў машыннага даення. Дарэчы, гэтая прафесія больш мужчынская, чым жаночая. Проста ў нас так склалася, што даіць кароў — быццам бы жаночая справа.

І колькі ні біліся над вырашэннем згаданага пытання, яго так і не вырашылі. З усёй адказнасцю магу заявіць, што гэтая праблема не будзе вырашана і ў бліжэйшы час. Прычына банальная: праца даяркі вельмі цяжкая, бо трэба рана падымацца, позна класціся спаць. Аператар машыннага даення ўвесь час "прывязаны" да свайго працоўнага месца. Да ўсяго гэтага — надта малы заробак, нават у тых гаспадарках, якія лічацца адносна паспяховымі ў эканамічным сэнсе і маюць высокі ўзровень надояў. Заробак даяркі не дасягае і мільёна рублёў! А што ўжо казаць пра іншыя гаспадаркі, якія знаходзяцца ў даволі складаных фінансавых і эканамічных умовах? Там заробкі даярак не перавышаюць і 300 тысяч..

Можна ўпэўнена сказаць, што прывабнай гэтая прафесія будзе толькі тады, калі ў сельскай гаспадарцы пачне прызнавацца прыватная ўласнасць. Калі з'явіцца гаспадар, узнікне эканамічная зацікаўленасць.

Зусім новая з'ява — дэфіцыт кіраўнікоў гаспадарак. У тыя часы, калі я сам яшчэ быў кіраўніком сельскага раёна, такое проста немагчыма было ўявіць. Напрошваецца выснова, што ў нас склалася вельмі дрэнная сітуацыя з кіраўнікамі сельскіх гаспадарак. І я сам ведаю мноства фактаў, калі людзей настойліва агітуюць узначаліць тую ці іншую гаспадарку, а яны катэгарычна адмаўляюцца. Чаму настолькі непрыстыжнай стала прафесія кіраўніка сельскагаспадарчага вытворчага комплекса (СВК)? Ва ўмовах каманднаадміністрацыйнай сістэмы да іх ставяцца як да расходнага матэрыялу. Пры гэтым заробкі дадзенай групы кіраўнікоў не выглядаюць прывабнымі. І вельмі часта для таго, каб забяспечыць годны ўзровень для сябе і сваёй сям'і, гэтыя людзі аказваюцца перад сумніўным выбарам — жыць па сродках, але не зводзіць канцы з канцамі, або вырашацца на розныя "дамоўленасці", якія, у сваю чаргу, могуць прывесці да цеснага знаёмства з праваахоўнымі органамі...

**ЖАННА ЛЯВІЦКАЯ**

# САВЕТ ЕЎРОПЫ ЧАКАЕ МІНСК

Старшыня Камітэта міністраў Савета Еўропы, кіраўнік федэральнага дэпартамента замежных спраў Швейцарыі Мішлін Кальмі-Рэй заклікала беларускае кіраўніцтва ўзмацніць намаганні ў справе набліжэння да названай арганізацыі.

«У нас ёсць падставы меркаваць, што Беларусь на 18 сакавіка здзейсніла два смяротныя прысуды. Гэты факт з'яўляецца сур'ёзнай перашкодай на шляху збліжэння паміж Мінскам і Саветам Еўропы",— заявіла **Кальмі-Рэй**.

Паводле яе слоў, яна чакае ад Беларусі скасавання смяротнага пакарання — толькі тады дыялог паміж Мінскам і Страсбургам можа быць адноўлены.

**РАДЫЁ СВАБОДА**

# ГАТЭЛЬ З КАЗІНО ЗАМЕСТ КЛЯШТАРА

**У сценах самага каштоўнага і аўтэнтычнага помніка Верхняга горада Мінска — бернардынскага комплексу XVIII стагоддзя ў бліжэйшай перспектытве паўстане гатэль з паркінгам, казіно і музеем.**



*Камусьці такі выгляд унікальнага Бернардынскага комплексу XVIII стагоддзя не падабаецца*

Пытанне даўно вырашана і зацверджана, як гарадскімі ўладамі, гэтак і кіраўніцтвам краіны. Аб гэтым на днях заявіў галоўны інжынер камунальнага ўнітарнага прадпрыемства "Мінская спадчына" Міхаіл Жых.

## ТРАГІЧНЫ ЛЁС СВЯТЫНІ

Ідзецца пра комплекс бернардынскага кляштара з касцёлам святога Язэпа, размешчаны на сталічнай плошчы Свабоды. Будаўніцтва каменнага касцёла пачалося ў канцы 1640-х гадоў на народныя ахвяраванні. У 1864-м пасля падаўлення паўстання Каліноўскага расійскія ўлады канфіскавалі кляштарны комплекс, які займаў цэлы квартал у раёне Высокага рынку (сёння — пл. Свабоды). Да 1872 года там месцілася праваслаўная палкавая царква святых Кірылы і Мяфодзія, пасля — архіў.

Але напрыканцы 1990-х пад выглядам аднаўлення гандлёвых шэрагаў, якія прылягалі да кляштара, улады санкцыянавалі пабудову піўной рэстаўрацыі. Пры гэтым былі зруйнаваны старажытныя пахаванні фундатараў бажніцы і манахаў.

Пачынаючы ад 2004 года вернікі рэгулярна моляцца на прыступках святыні за яе вяртанне. У 2005-м з падобнай просьбай да ўлад звярнулася кіраўніцтва Беларускага Касцёла. Былі спадзевы, што раскватараваныя ў святых сценах Белдзяржархіў навукова-тэхнічнай дакументацыі і Белдзяржархіў — музей літаратуры і мастацтва пераедуць у будынак Нацыянальнай бібліятэкі. Замест гэтага ўвесну 2007 года на старонках апазіцыйнай прэсы выбухнула жахлівая навіна. Як стала вядома, яшчэ годам раней старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў прыняў рашэнне аб выдзяленні з бюджэту 1,4 мільярда рублёў на «рэканструкцыю і рэстаўрацыю помніка XVII—XVIII стагоддзяў — комплексу будынкаў №№ 6, 8 па вуліцы Кірылы і Мяфодзія з прыстасаваннем пад гасцінічны комплекс і аб'екты гандлёва-побытавага прызначэння". Пад апошнімі меўся на ўвазе падземны паркінг, казіно і нават басейн. Падкрэслім: рашэнне было прынята патаемна і афіцыйна так і не было абнародавана.

## ЗМАГАННЕ ЗА ЯЗЭПА

Тым часам 20 тысяч чалавек (велізарная лічба для сённяшняй Беларусі!) падпісалі зварот да Аляксандра Лукашэнкі з патрабаваннем вярнуць вернікам касцёл, які быў пабудаваны менавіта на грошы гараджан. З просьбай паспрыяць гэтаму група беларускіх інтэлектуалаў напісала адкрыты ліст Папе Рымскаму Бенядыкту XVI. Пасля пратэстаў грамадскасці па даручэнні Адміністрацыі прэзідэнта была створана міжведамасная камісія для вывучэння пытання аб планаванай рэканструкцыі ўнікальных аб'ектаў. У комплексе правялі раскопкі, на пэўны час ён знік з навіновых паведамленняў СМІ.

## КАНЧАТКОВА І НЕЗВАРОТНА

Гэтай вясной стала вядома, што КУП "Мінскпраект" з 2007 года па замове "Мінскай спадчыны", на балансе якой знаходзяцца будынкі былога кляштара (Кірылы і Мяфодзія 6,8), распрацоўвае праектна-каштарысную дакументацыю па яго рэканструкцыі з прыстасаваннем пад гасцінічны комплекс. Даведаўшыся пра гэта, мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч звярнуўся да Лукашэнкі з просьбай перадаць помнік вернікам. Аднак спадзеву на тое, што нешта змяніцца, ўжо не засталося.

Выступаючы ў жывым эфіры інтэрнэт-партала TUT.BY, галоўны інжынер "Мінскай спадчыны" Міхаіл Жых запэўніў, што рашэнне прынята канчатковае і незваротнае.

"Канструкцыя былога кляштара складаецца са скляпенняў, якія нельга руйнаваць. Таму было прынята адзінае правільнае рашэнне — максімальна наблізіць цяперашнія функцыі аб'екта да тых, якія ён выконваў у XVII—XVIII стагоддзях, калі ў ім месціліся келлі. Цяпер завяршаецца будаўнічае праектаванне. У самім будынку кляштара (№ 6) размесціцца гатэль, а ў будынках пад № 8 — рэстаран, побытавы сэрвіс, банк, карэтны музей. Таксама мы хочам музеіфікаваць археалагічныя знаходкі, выяўленыя ў двары комплексу", — распавёў Жых.

Паводле ягоных словаў, будынак былога касцёла (Кірылы і Мяфодзія, 4) знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы, і ў ім па-ранейшаму застанецца архіў.

Старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч, які таксама звярнуўся з адкрытым лістом да Лукашэнкі, лічыць, што нельга дапусціць рэалізацыі гэтага праекта, які "знішчае амаль 70% аўтэнтычных канструкцый кляштара" і ператварае яго ў псеўдагістарычны муляж. "Неаднаразовыя затапленні памяшканняў, дэмантаж і знікненне ўнікальных каваных рашотак і парэнчаў — усё гэта сведчыць пра абыякавае стаўленне "Мінскай спадчыны" да захавання помніка, — распавёў "Тут і цяпер" Антон Астаповіч. — Я перакананы, што захаваць і рэстаўраваць помнік з выкананнем усіх прававых і метадычных нормаў можа толькі Рымска-каталіцкая царква ў Беларусі, якая паказала навукова абгрунтаваныя падыходы пры рэстаўрацыі шэрагу касцёлаў краіны".

## "СПАДЧЫНА" ЗНІШЧАЕ СПАДЧЫНУ

З выступу Тадэвуша Кандрусевіча на прэс-канферэнцыі 23 сакавіка:

— Важна зразумець, што гэта будзе не толькі рэстаўрацыя, але таксама і рэканструкцыя, пасля якой вы не пазнаеце будынак храма. Сёння, калі ўвесь свет так моцна клапоціцца пра тое, каб захаваць спадчыну, «Мінская спадчына», якая павінна захоўваць спадчыну, разбурае фактычна яе (перапрашаю за рэзкасць). "Спадчына" павінна захоўваць спадчыну. Бо што ж мы перададзім новаму пакаленню? — адзначыў мітрапаліт. — Так, каталіцкая царква можа не выкарыстоўваць свае будынкі. У такім выпадку яна можа іх прадаць альбо падарыць... Але тыя храмы былі перададзеныя, а касцёл св. Юзэфа быў проста канфіскаваны. Гэта зусім іншая сітуацыя.

**АНДРУСЬ ХВАЁВЫ**

# ПАД ТОЎШЧАЙ ЧАРНОБЫЛЬСКАГА ПОПЕЛУ

Сёлета, у чарговую (24-ю) гадавіну чарнобыльскай катастрофы Аляксей Янукевіч і яго паплечнікі вырашылі напярэдадні 26 красавіка наведаць забруджаныя тэрыторыі ў Магілёўскай вобласці.

## І ВЯНКІ НА МЕСЦЫ БЫЛЫХ ПАСЕЛІШЧАЎ

Жадаючых паўдзельнічаць у сустрэчах з людзьмі ў "чарнобыльскіх" вёсках, адкуль не ўдалося перасяліць усіх жыхароў, набралася ажно 3 мікрааўтобусы. Актывісты везлі з сабой сціплую гуманітарную дапамогу, кветкі і вянкі на месцы тых былых паселішчаў, якія ў першыя пасляаварыйныя гады з-за высокага ўзроўню радыяцыі былі канчаткова пахаваны бульдозерамі пад тоўшчай зямлі і бетону.

Першым прыпынкам наведвальнікаў стаўся Чэрыкаўскі раён. Тут актывісты паслядоўна спыняліся перад памятнымі камянямі, што пазначаюць назвы колішніх вёсак, якія давялося засыпаць зямлёй: Вепрын, Чудзяны, Малінаўка… На кожны камень быў пакладзены вянок з бел-чырвона-белых кветак і жалобнай стужкай.

**ДА ВЕДАМА**

На Магілёўшчыне ў так званай "чарнобыльскай зоне" з рознымі паказчыкамі радыяцыйнага забруджання апынуліся трынаццаць адміністрацыйных раёнаў з дваццаці аднаго. Дагэтуль большасць з іх мае статус пацярпелых з адпаведнымі абмежаваннямі ў рэжыме пражывання там людзей і наведвання прыезджымі, а таксама ў ажыццяўленні гаспадарчай дзейнасці. А вось іншыя мясцовыя даныя па тэме:

**— у рэгіёне былі эвакуіраваны жыхары 141 населенага пункта;**

**— было "пахавана" 90 вёсак;**

**— з месцаў сталага пражывання было адселена 21 522 чалавекі;**

**— да гэтага часу 35% тэрыторыі вобласці забруджана радыенуклідамі.**




*Наступствы аварыі на ЧАЭС дагэтуль належным чынам не ацэненыя*

## "ВЫПАДКОВЫ" ЛЕС

Далей партыйны "чарнобыльскі дэсант" накіраваўся на ўсход, да забруджаных Касцюковіцкага і Краснапольскага раёнаў. Па дарозе мікрааўтобусы спыніліся на ўскрайку Чэрыкаўшчыны каля былой вёскі Малінаўка. Тут, калі яшчэ толькі выпрацоўвалася савецкая канцэпцыя барацьбы з наступствамі тэхнагеннай аварыі, паспелі пабудаваць (у самай гарачай кропцы забруджання!) цэлы пасёлак, куды меркавалася перасяліць людзей з іншых вёсак. Вось толькі забыліся напачатку дакладна вымераць тут узровень радыяцыі, а калі зрабілі гэта, аказалася, што пасёлак першым падпадае пад тэрміновае перасяленне. З таго часу вуліцы з пустымі катэджамі зарастаюць маладым лесам. Кінутыя дамы, "выпадковы" лес і птушыны гоман у адсутнасці чалавека і прыкмет ягонага гаспадарання зрабілі на наведвальнікаў моцнае ўражанне. Алесь Янукевіч распавёў журналісту, які суправаджаў гасцей падчас паездкі:

— Я не магу вам перадаць, што адчуваю… Гэта надта хвалююча і нават страшна. Патрэбна рэабілітацыя тэрыторый, рэабілітацыя людзей, маралі і палітыкі. За апошнія гады ўсё ў нас нібыта прысыпана пэўнай тоўшчай попелу.

## "ЖЫВІЦЕ, ЯК ХОЧАЦЕ"

Наведвальнікі тым часам сустрэлі двух старых, якія жывуць у даўно выселенай вёсцы: 80-гадовыя муж і жонка бядуюць тут у адзіноце. Гадоў 10 таму яны адмовіліся пакінуць родны кут, а потым, як памятаем, і "канцэпцыя" змянілася, бо з высокіх вуснаў зляцела аднойчы: "А, жывіце, дзе хочаце. Нічога страшнага ў гэтым няма…". Вось і жывуць, калі так можна сказаць, — ваду бяруць са старога паваленага калодзежа, дровы — з бліжэйшага лесу. Тое-сёе перападае з аўталаўкі, якая зрэдку, але ж заязджае сюды. Прывыкшыя ўсё жыццё працаваць, старыя гадуюць свінню і некалькі кур. Апошнім часам усё часцей думаюць пра тое, што варта нарэшце падацца да дзяцей, якія даўно перабраліся ў горад…

Удзельнікі паездкі ў магілёўскую "чарнобыльскую зону" засталіся задаволены яе вынікамі. А першыя высновы па дарозе ў сталіцу ад імя ўсіх наведвальнікаў сфармуляваў Аляксей Янукевіч:

—Будзем патрабаваць нарэшце рассакрэціць усю інфармацыю, якая тычыцца наступстваў аварыі, у тым ліку і звесткі медычнага характару.

**ВІКТАР ВОЙТ**

# КАЛІ ПАШПАРТУ НЯМА ДАВЕРУ

На пачатку перадвыбарнага працэсу ўлады ў асобе старшыні ЦВК паабяцалі, што мясцовыя выбары (адбыліся ў мінулую нядзелю) будуць самымі што ні на ёсць дэмакратычнымі й празрыстымі.

Памятаеце, нават былі нейкія парады наконт таго, як даць магчымасць скарыстацца сваім "грамадзянскім правам" тым, у каго не будзе пры сабе пашпарта. На жаль, выпадак з маці майго сябра сведчыць, што выбары ўсё ж не былі шырока даступнымі ўсім грамадзянам.

Гісторыя даволі простая: пажылая кабета (спадарыня Валянціна) дагэтуль не замяніла свой, яшчэ савецкі, пашпарт на беларускі, бо даўно хварэе і далей за бліжэйшую краму (гэта метраў 100, на шчасце) дайсці не можа. Таму атрыманне новага пашпарта — а працэдура гэтая патрабуе ўласнай прысутнасці чалавека і неаднаразовага наведвання ім адпаведных кабінетаў — для яе заставалася (і застаецца) невыканальнай справай.

Бабуля даручыла сыну звярнуцца ў Магілёўскую ўчастковую камісію № 145 з пытаннем, ці зможа жанчына прагаласаваць за кандыдата, які ёй спадабаўся, маючы не цяперашні пашпарт, а той, "сярпаста-малаткасты". Сын быў упэўнены, што такое жаданне і магчымасць цалкам падпадаюць пад дазвол ЦВК галасаваць у пэўных выпадках "без пашпарта".

На жаль, пасля наведвання камісіі сын быў вымушаны засмуціць маці. Я быў пры гэтым і сведчу: дазволу мы не атрымалі. Высветлілася, што "савецкі пашпарт" тут ужо не ў пашане.

А можа справа палягала ў тым, што мой сябра, сын пакрыўджанай выбаршчыцы спадарыні Валянціны, з'яўляецца чальцом Партыі БНФ? Маці падтрымлівае сына ў яго палітычных памкненнях. Да таго ж на папярэдніх выбарах (тры гады таму) ён сам вылучаўся на гэтым жа ўчастку як апанент улады. Камісія з таго часу, дарэчы, практычна не змяніла свайго складу, так што сябра мой тут добра вядомы…

**ЯН ШЫШКА**

# ТАЯ САМАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

**Курманбека Бакіева наўрад ці можна лічыць класічным “крывавым дыктатарам”. Праўда, адрозна ад свайго папярэдніка — кіргізскага прэзідэнта Акаева, Бакіеў пакінуў пасля сябе некалькі дзясяткаў трупаў людзей, расстраляных прэзідэнцкай аховай.**




*Не бывае дзвюх аднолькавых рэвалюцый*

Але гэта яшчэ патрабуе поўнага расследавання і доказаў у судзе. Не назавеш Бакіева і азіяцкім дэспатам, які патанаў у раскошы. Прынамсі, шматлікіх палацаў, як, напрыклад, у Садама Хусейна ў Іраку, у яго не было. Аднак тут важней адказаць на пытанне пра легітымнасць звяржэння дыктатуры. Аляксандр Лукашэнка, які запрасіў свайго калегу ў Мінск, лічыць, што Бакіеў быў і застаецца законна абраным прэзідэнтам Кыргызстана, і таму, маўляў, меў поўнае права абараняцца і загадваць страляць ва ўдзельнікаў “дзяржаўнага перавароту”.

Вядома, што Расія, іншыя краіны СНД, Захад прызнавалі ўрад Бакіева, пакуль ён быў ва ўладзе, а пасля яго вымушаных уцёкаў са сталіцы рэзка адвярнуліся ад экс-кіраўніка дзяржавы. Аднак такая справа — не новая ў гісторыі. Ніхто не аспрэчваў, напрыклад, легітымнасці кіраўніка камуністычнай Румыніі Чаўшэску пры яго жыцці. Яго хоць і крытыкавалі на Захадзе, але сустракаліся з ім, вялі перамовы. А ў снежні 1990-га, пасля расстрэлу мірнай дэманстрацыі ў цэнтры Бухарэста і ўсенароднага паўстання, яго разам з жонкай узялі ды расстралялі без суда. Сам па сабе гэты факт жахлівы, але ніхто, у тым ліку і ў СССР, не выступіў у абарону дыктатара.

Іншы прыклад — Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 года, якую самі бальшавікі называлі “пераваротам”. (Забаўная рэч: знакамітыя словы “Тая самая рэвалюцыя, пра якую так доўга гаварылі бальшавікі, адбылася!” належаць не Леніну, а Луначарскаму. Ён прамовіў іх падчас з’езда Саветаў, на якім, насуперак савецкім фільмам, Леніна не было.)

Між іншым, Беларусь застаецца ці не апошняй краінай СНД, дзе 7 лістапада адзначаецца як дзяржаўнае свята, а савецкая дзяржава дагэтуль афіцыйна лічыцца ўзорам для рэспублікі.

Дарэчы, Савецкую Расію не адразу прызналі ў свеце. Захад нават арганізаваў інтэрвенцыю супраць бальшавіцкай улады, а Злучаныя Штаты Амерыкі прызналі Савецкі Саюз толькі ў сярэдзіне 1930-х гадоў. Цікава, што ЗША, якія былі галоўным антаганістам СССР увесь час яго існавання, таксама ўзніклі ў выніку рэвалюцыі (канец XVIII стагоддзя). Самі амерыканцы, дарэчы, на гэты факт не забываюцца і ганарацца ім. Больш за тое, пра неабходнасць народнага апалчэння “для бяспекі свабоднай дзяржавы” і права народа насіць зброю гаворыцца ў другой папраўцы да Канстытуцыі ЗША. У першай папраўцы гаворка ідзе пра свабоду слова.

Варта нагадаць, што і ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у самым пачатку запісана: “Мы, народ…” (а не “Мы, Прэзідэнт...”). Як паказала практыка, Канстытуцыю можна мяняць пад кіраўніка дзяржавы. Але ў такім выпадку не варта разважаць пра легітымнасць улады.

Зразумела, паміж рэвалюцыямі мінулых стагоддзяў і бяскроўнымі “каляровымі” рэвалюцыямі сучаснасці — дыстанцыя агромністага памеру. Гвалтоўны пераварот у Бішкеку выглядае, хутчэй, як выключэнне з правіл. Але справа ў тым, што рэвалюцыю як з’яву — падабаецца гэта камусьці ці не — ніхто ў свеце яшчэ не змог адмяніць. Лукашэнка кажа, што не баіцца паўтарэння кіргізскіх падзей у Беларусі, бо беларуская апазіцыя слабая. Але ж антыпрэзідэнцкае паўстанне 7 красавіка ў Бішкеку стала для тамтэйшай апазіцыі такой жа самай нечаканасцю, як і для ўлад. Кіргізская апазіцыя таксама была раз’яднанай, не мела доступу да дзяржаўных СМІ і карысталася вельмі абмежаваным уплывам у грамадстве. Таму тыя падзеі выглядаюць асабліва пагрозлівымі для рэжымаў, якія хваляцца вертыкаллю ўлады і стабільнасцю.

Зразумела, у Беларусі сёння зусім іншыя ўмовы — народ у масе сваёй жыве нашмат лепей, чым у Кыргызстане. Але, як вядома, не бывае дзвюх аднолькавых рэвалюцый.

Кажуць, што генералы заўсёды рыхтуюцца да мінулай вайны. Гэтаксама ўлады заўсёды імкнуцца пазбегнуць паўтарэння мінулых рэвалюцый у чужых краінах…

**МАКСІМ ПЕШКА**

**КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ НАШУ ГАЗЕТУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ,**
ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.SVABODABY.NET.

**КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ ГАЗЕТЫ,**
ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL info@svabodaby.net ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: info@svabodaby.net) **Падпісана ў друк** 21:45 28.04.10
Тыраж 299 экзэмпляраў